Тыднёвік Магілёўскі

№ 3 (34)

27.02.98



БНФ сёння: апазыцыя ці вызвольны рух

Менавіта такое стратэгічнае пытанне апынулася ў цэнтры дыскусіі, што разгарнулася на лютаўскім паседжанні Сойму БНФ. Як заўсёды алею ў агонь падбавіў «палітычна недэлікатны» лідэр Фронту Зянон Пазьняк, які даслаў Сойму свой даволі рэзкі факсавы выступ. Ж'ім ён ізноў засведчыў сваё цвёрдае перакананне, што палітыка, якая апраўдвае сваю непрыстойнасць і непрынцыповасць нібыта улікам так званых «рэальных абставін», была і застаецца ў беларускай (таксама рэальнай сітуацыі) палітыкай здрадніцкай, як бы ее лідэры не цанілі сябе «аб'ектыўнай» блізкасцю да сапраўднага стану грамадства і «аб'ектыўнай жа» немагчымасцю зрабіць больш у варунках цяперашняга рэжыму.

Лідэр Фронту прапанаваў (і патрабаваў) унесці сур'ёзныя карэктывы ў канкрэтныя і стратэгічныя дзеянні Руху. Адзначым, што — пасля вострага абмеркавання — Сойм Фронту прыняў гэтыя прапановы.

<u>У чым іх сутнасць, — чытачы Тыднёвіка могуць даведацца з выступу З.Пазьняка, які мы друкуем сёння на 2-й стар. (з нязначнымі скаротамі).</u>

Хартыя'97

CHARTER

Попова Лидия
[illegible] Татьяна
Попов Андрей
Рысков Юрий
Репинский Андрей
Ивчик Валерий
[illegible] Георгий
[illegible] Виктор
Королев Владимир
[illegible] [illegible]
[illegible] Галина
Королева Раиса
Шухман Людмила
[illegible] Валентина
[illegible] Игорь
[illegible] Светлана
[illegible] Михаил
Шевченко Тамара
Шевченко Виктор
Ерошкова Анна В.
Дубровская Валентина
Проглядов Андрей
Мурина Ольга
[illegible] Татьяна
Ханкевич Виктор
Попов Сергей
Корх Михаил
[illegible] Ира А.
[illegible] Юрий А.
[illegible] Светлана А.
Соколова Людмила
[illegible] Нина Ив.

Прайшло 100 дзён з дня абвешчання і першага падпісання Беларускай ХАРТЫІ-97. За гэты час пад ёй паставілі свае подпісы больш за 50 тысячаў грамадзянаў краіны, сярод якіх шмат, так бы мовіць, не толькі палітычна і грамадска актыўных людзей. Словы дакумэнта, што заклікае да жыцця па праўдзе і сумленню, да недапушчэння з боку ўладаў парушэнняў дэмакратыі і правоў чалавека, да захавання ўсімі законнасці і маралі і, нарэшце, да грамадзянскай адказнасці кожнага за лёс незалежнасці і волі Бацькаўшчыны, — гэтыя словы знайшлі і працягваюць знаходзіць прыхільнікаў сярод самых розных слаёў беларускага грамадства. Сталыя і маладыя, рабочыя і сяляне, інтэлігенты і прадпрымальнікі ўсё больш выразна разумеюць: лёс краіны залежыць ад саміх нас!

Адзначаючы 100-дзённы юбілей Хартыі-97 мы друкуем адзін з падпісных лістоў, які ў штаб-кватэру Хартыі перадалі магілёўскія прыватныя прадпрымальнікі. Адначасова паведамляем, што свае подпісы пад гэтым дакумэнтам можна дасылаць і на адрас нашай рэдакцыі, якая стала калектыўным удзельнікам Хартыі-97

<u>ПРАТРЫМАЛІСЯ БОЛЬШ ЗА ІНШЫХ</u>

У сярэдзіне лютага пасля 15-дзённага страйку на свае гандлёвыя месцы вярнуліся магілёўскія прыватнікі. Вяртанне на стадыённы і іншыя рынкі горада адбылося па рашэнні прадпрымальніцкага прафсаюзнага камітэта як рэакцыя на тое, што дзень байкоту абыходзіўся кожнаму прадпрымальніку ў сярэднім у 500 тыс. беларускіх рублёў. Аднак гандляркі не знялі сваіх патрабаванняў і гатовыя надалей адстойваць свае правы, пра што маюць намер напомніць уладам заморожаным на 1-е сакавіка «шэсцемпахаваннем прадпрымальніцтва». ТЫДНЁВІК звярнуўся да старшыні рэгіянальнай Рады Свабодных прафсаюзаў Сяргея Абадоўскага з просьбай пракамэнтаваць сітуацыю, што выявілася падчас дэманстратыўнага і для многіх нечаканага выступлення прадпрымальнікаў супраць улады.

Магчыма, што гэта толькі пачатак

— Існуючы ў нас рэжым, што імкнецца замест правядзення патрэбных эканамічных рэформаў абвергнуць самое жыццё, даволі нервова сустрэў выступленні прадпрымальнікаў, бо доўгі час, і не без падстаў, лічыў гэты асяродак грамадства найбольш лаяльным да сябе і даволі апатычным. Але, як гаворыцца, усяму ёсць мяжа: пасля прыняцця ўрадам новага парадку падаткаабкладання, а таксама сертыфікацыі і ліпенічнай рэгістрацыі тавараў цярпенню прыватнікаў прыйшоў канец. Яны на многае глядзяць пакорліва, да многага, абсалютна ненармальнага, прызвычаіліся. Гэта, на жаль, праўда. Аднак жа вытрымаць чарговы здзек над сабой адмовіліся. Хто ведае знакаміты савецкі анэкдот аб вяроўцы (прыносіць з сабой, ці прафком выдасць?), лёгка іх зразумее. Па новаму парадку сертыфікацыі і рэгістрацыі магілёўцам трэба везці ў адпаведныя дзяржаўныя ўстановы, што размешчаны ў Менску, па некалькі ўзораў сваіх тавараў (не менш трох), самім аплочваць усе выдаткі, звязаныя з дастаўкай тавараў у сталіцу і «паслугамі» рэгістрацыйных установаў; чакаць, зразумела, без права гандлю, як мінімум месяц, дазваляючыя дакумэнты і, нарэшце, пакідаць «дзяржаве» (дарыць, па-простаму) тыя самыя прадастаўленыя на рэгістрацыю тавары, бо «па правілах» яны не вяртаюцца ўладальніку ні пры ўмове, калі пройдуць рэгістрацыю, ні пры ўмове, калі яе не атрымаюць.

Магілёўскі бюджэт за дні, што страйкавалі прыватныя гандляры, згубіў самае малое 5 мільярдаў рублёў. Але гарадское кіраўніцтва падчас прадпрымальніцкіх падзеяў паводзіла сябе на дзіва абыякава і спакойна. Крыху большую «цікавасць» да сітуацыі праявіла абласное кіраўніцтва, прадэманстраваўшы (добра, каб не засталося гэта на словах) нібыта разуменне справядлівасці прадпрымальніцкіх патрабаванняў. А горад тым часам якраз падводзіў пераможныя вынікі «спаборніцтва» за мінулы год за ўсіх галінах гаспадаркі, і старшыні гарвыканкама Сівіцкаму і асабліва ягонаму першаму намесніку Іванчанку было не да нейкіх там дробных прыватнікаў. Абмінулі сваёй увагай магілёўскіх прыватнікаў і міністр (кажуць, што «па прадпрымальніцтву») Сазонаў і нават, больш таго, суправаджаўшы яго ў наведванні Магілёва прадпрымальніцкі прэзыдэнт Карагін. Яны былі там, дзе адбывалася «чествование» пераможцаў, і з тымі, каго ўлада шчодра адзначала за «ударный труд».

Ну, а нашы несвядомыя «неўдарнікі», пратрымаўшыся 15 дзён, а гэта больш, чым страйкоўцы ў іншых гарадах краіны, узялі перапынак на час чакання абяцанага афіцыйнага рашэння ўраду па наспеўшых праблемах. Калі паразуменне не будзе знойдзена, магілёўцы гатовыя зноў выступіць у сваю абарону пры самай шырокай падтрымцы сваіх справядлівых намаганняў з боку Свабодных прафсаюзаў. Спадзяемся, што і тыя, хто карыстаюцца паслугамі прыватных гандляроў, выкажуць свае адносіны да недапушчальнага націску на прадпрымальніцкі сэктар эканомікі. Тым больш, што ў выніку гэтага націску цэны на тавары падскочаць як малае ў 5-7 разоў.

Яшчэ ні адной краіне, ні аднаму ўраду, ні аднаму прэзыдэнту не ўдавалася падмануць эканамічныя законы. Колькі б не працягваліся падобныя эксперыменты. Справа толькі ў тым, што сацыяльны кошт выпраўлення сітуацыі, кошт вяртання да здаровага сэнсу і нармальных правілаў жыцця павялічваецца з кожным днём працягвання курсу на каманднаадміністратыўную эканоміку. Сумленна ў гэтых абставінах паводзяць сябе не тыя, хто трымаецца гэтага курса з-за страху або «па пасадзе», а тыя, хто адкрыта выступае супраць яго. Як гэта і зрабілі ў лютым магілёўскія прадпрымальнікі, пераадолеўшы нарэшце інэрцыю і паасобніцтва, яшчэ надта характэрныя для многіх з нас. Але жыццё, як бачым, не стаіць на месцы. Магчыма, што гэтая вясна дасць і іншыя прыклады «прасвятлення» і працоўнай салідарнасці.

Для ТМ — па электроннай пошце

<u>У ВОРШЫ АБРАБАВАНА</u> рэдакцыя дэмакратычнай газэты «Куцейна». Выкрадзена аргтэхніка на суму каля 7 тыс. даляраў, а таксама камп'ютарная выдавецкая праграма, база дадзеных і бягучыя журналісцкія матэрыялы. Рэдакцыя бачыць матывы злачынства менавіта ў дэмакратычнай накіраванасці сваёй газэты.

<u>ЖАХЛІВЫ ПА ЖОРСТКАСЦІ</u> прысуд вынес менскі суддзя У. Лаўроў маладым палітвязням Вадзіму Лабковічу і Алесю Шыдлоўскаму. Нягледзячы на тое, што нават пракурор (з-за недаказанасці факту) на працэсе адмовіўся падтрымліваць абвінавачванне хлопцаў у знявазе «дзяржаўнага сцяга» і нанясенні шкоды «мастацкім каштоўнасцям» (помніку Дзяржынскаму ў Стоўбцах), суддзя прысудзіў паўтара года непаўналетняму Вадзіму (з адтэрміноўкай на два гады) і столькі ж Алесю з утрыманнем таго ў калоніі ўзмоцненага рэжыму. Па меркаванні назіральнікаў на працэсе гэта нішто іншае, як палітычная расправа ўлады і асабіста Лукашэнкі з хлопцамі, якія не любяць прэзыдэнта і ўдзельнічаюць у барацьбе (дапушчальнай законам) за змену цяперашняга таталітарнага рэжыму на карысць незалежнай, вольнай і дэмакратычнай Беларусі. Пасля «судовага працэсу» Вадзім, які быў вызвалены з-пад варты ў зале суда, заявіў журналістам, што не спыніць свайго змагання і будзе прымаць магчымыя меры да вызвалення з лагеру свайго сябра.

Менскі суд над актывістамі Маладога Фронту вызначыўся і тым, што каля яго памяшкання ОМОН не толькі перашкаджаў людзям, асабліва маладым, наведваць залу суда, але і затрымаў ні за што трох найбольш «неспадабаўшыхся» сержантам хлопцаў і журналіста Шчукіна, на якіх міліцыя адразу ж завяла «адміністратыўную справу».

<u>ЭЎРАПАРЛАМЭНТ У ЧАРГОВЫ РАЗ</u> заклікаў улады Беларусі прытрымлівацца міжнародных нормаў у галіне правоў чалавека. У тым ліку ён заклікаў пакласці канец запалохванню журналістаў і, у прыватнасці, прызначыць расследаванне па факце збівання вядомага рэжысёра Юрыя Хвашчавацкага.

БЕЛАПАН — спэцыяльна для ТМ.

Палітыка без стратэгіі — непрыстойная мітусня



АБ АПАЗЫЦЫІ

Мы павінны ўсведаміць пэрспэктыву і мэханізм барацьбы з акупацыйнай дыктатурай. Цяпер у Беларусі няма легітымнага парлямэнту. Няма каму аб'явіць выбары па Канстытуцыі 1994 г. Няведама як іх праводзіць і забяспечыць. Наша грамадства не мае адказу на гэтае пытанне. А значыць, зруху ня будзе. Сітуацыя мае ўсе прыкметы палітычнага балота. Лібэралы і былыя лукашэнкаўскія кампанейцы з Вярхоўнага Савета, не маючы апоры ў грамадстве, накіраваліся па старой звычцы ў Маскву. Прапануюць там свае танныя паслугі, амаль дармовыя, спадзяюцца, што Масква пакарае іхняга крыўдзіцеля Лукашэнку і паставіць іх да ўлады. Танны тавар не мае даверу. Але калі б уявіць, што іх купяць, то гэтыя спадары спусцілі б Беларусь Маскве нават не за капеечку, а за так. Тыя ж, хто ад іх своечасова не адмятуцца, будуць лічыцца саўдзельнікамі ў здрадзе і могуць паставіць у палітыцы на сябе крыж. Лукашэнка гандлюецца як чорт з п'яніцам: я вам Беларусь, вы мне — уладу над вамі. Гэтыя ж прадаюцца: вазьміце нас, мы будзем паслушнымі... Шчыра кажучы, у публічнай палітыцы больш прымітыўнага халуйства мне сустракаць яшчэ не даводзілася.

Вось чаму я, шаноўныя калегі, пасля лістападаўскага перавароту прапанаваў Фронту не называцца больш "апазыцыяй", а называцца вызвольным рухам. Бо пасля таго, як В.Ціхіня, С.Шарэцкі, Г.Карпенка, П.Краўчанка здрадзілі і прадалі агульную справу імпічманту, слова "апазыцыя" паступова стала для нас ганебным кляймом. Трэба рашуча скідаць гэты камень з шыі, бо ён цягне нас на палітычнае дно.

Апазыцыйная група Вярхоўнага Савета даўно (яшчэ летам 97-га) палітычна вычарпала сябе і зараз знаходзіцца ў стане пэрманентнага маразму. Мы не адкінулі іх адразу пасля перавароту, бо, па-першае, зыходзілі з прагматычных меркаванняў; па-другое, спадзяваліся, што яны нешта зразумеюць. Нічога яны не зразумелі і ўжо не зразумеюць. Маразм сітуацыі з "апазыцыяй" характарызуецца, як бачым, поўным абсурдам. Яны супраць Лукашэнкі, але стаяць на ягоных пазыцыях і хочуць пераканаць Маскву, што іхняя пазыцыя лепшая для Масквы, чым лукашэнкаўская. Гэта ўзровень склокі паўкрыджанай азлобленай чэлядзі, якая не мае ніякага грунту ў грамадстве, а не ўзровень нацыянальнай палітыкі (і ўвогуле, палітыкі).

АБ СТРАТЭГІЧНАЙ ІНІЦЫЯТЫВЕ Ў ПАЛІТЫЦЫ БНФ

Адзіным інстытутам легітымнай беларускай улады засталася Рада Беларускай Народнай Рэспублікі. Нагадаю, што згодна Статуту Рады БНР яна ёсць "найвышэйшая ўстанова і адзінае працоўнае прадстаўніцтва суверэнных правоў беларускага народу, выяўленых у прадстаўворчым Акце 25 сакавіка 1918 г., зафіксаваным 3-й Устаўной Граматай БНР.

Асноўная мэта і заданне Рады БНР — перахаванне і выкананне волі беларускага народу, а гэта — адбудова незалежнай беларускай дзяржаўнасці на ўсіх беларускіх землях усімі магчымымі і даступнымі спосабамі і дарогамі".

На 22-й сэсіі Рады БНР, якая адбылася ў мінулым годзе ў Нью-Брансвіку, у дакумантах было адзначана, што "утварэнне Рэспублікі Беларусь і замацаванне ейнай дзяржаўнай незалежнасці ў Канстытуцыі 1994 г. ёсць **этапам** на шляху да ажыццяўлення ідэалаў БНР, аб чым красамоўна засведчылі прынятыя Вярхоўным Саветам 12-га скліканьня дзяржаўныя сымбалі: бел-чырвона-белы сцяг і гэрб "Пагоня". Сэсія падкрэсліла, што практычным прадцягам і палітычным увасабленнем ідэалаў БНР зьяўляецца на Бацькаўшчыне Беларускі Народны Фронт.

Мы павінны дзейнічаць у рэчышчы гэтай адказнасці. Выбары ў парлямант Беларусі можа аб'явіць і правесці Рада БНР. Могуць быць два мэханізмы падыходу да гэтай справы:

а) Рада БНР прызнае Канстытуцыю 94-га г. і выбарчае заканадаўства на яе аснове. У адпаведны момант у Раду БНР далягуюцца дэпутаты, выбраныя на шырокай аснове ад БНФ і іншых беларускіх арганізацыяў. Дзейнасць Рады БНР з міжнароднай пераходзіць на беларускую глебу з усімі паўнамоцтвамі.

б) Рада БНР стварае сваю Канстытуцыю БНР і сваё выбарчае заканадаўства, па якім праводзіць выбары ў Беларусі. Дзеля падмацавання юрыдычнага грунту выбараў неабходна, каб большасць выбарцаў Беларусі прынялі грамадзянства Беларускай Народнай Рэспублікі. Пытанне аб грамадзянстве БНР было пастаўлена ў мінулым годзе на эўрапейскім сэктары Рады ў Вільні і паўсюдна здабыло станоўчыя водгукі. Тэхналёгія прыёму ў грамадзянства павінна быць распрацавана без прамаруджвання сумесна з Радай БНР.

Акцыя "Грамадзянства БНР" павінна стаць нашай фронтаўскай адказнай справай. Яна павінна супрацьстаяць задуманаму Масквой і Лукашэнкам уведзенню на Беларусі двайнога беларуска-расейскага грамадзянства. Яе трэба будзе праводзіць абавязкова і сумесна з акцыяй "АДСТАЎКА" і зборам подпісаў за адстаўку Лукашэнкі. Мы павінны заранёў сур'ёзна думаць пра 1999 год.

АБ 80-Й ГАДАВІНЕ БНР

У пляне ажыццяўлення нашых палітычных задач мы павінны падыходзіць і да сьвяткавання 80-годдзя БНР. Гэта павінны быць не проста ўгодкі, а акцыя нашай энэргічнай палітыкі. Бо тое, што мы робім і збіраемся рабіць, дасць вынікі пры шырокай падтрымцы і ўдзеле ўсёй нацыі. Мы можам гаварыць з усімі, гледзячы ў вочы, нам гэта лёгка, бо мы не прагіналіся, не хлусілі, не прадаваліся. Мы любім Беларусь не на словах і не дзеля кар'ернай мэты, а па поклічу сэрца, ахвяруемся ёй і гатовыя змагацца за яе волю і светласць пакуль будзем жывыя, пакуль не пераможам.





***У** суботу, 21 лютага, у магілёўскім Экуменічным цэнтры адбылася сустрэча прадстаўнікоў маладзёвых суполак горада, якія стаяць на дэмакратычных пазыцыях. Мэтай сустрэчы моладзі было пазнаёміцца і паспрабаваць прыйсці да супрацоўніцтва. Кожны з прадстаўнікоў распавёў аб сваёй арганізацыі і аб тых ідэях, на якіх іх дзейнасць грунтуецца.*

Спадарыня Вольга Сафонава выступіла з дакладам ад імя Хрысціянска-сацыяльнага саюза, "Патрыётаў Бацькаўшчыны" прэзентаваў Алесь Асіпцоў, "Грамадзянскі форум" — Аляксей Гераршчанка, "Маладую Граму" - Сяргей Гаўрыленка, Малады Фронт - Андрэй Кавалёў.

ТМ будзе далей інфармаваць сваіх чытачоў аб дзейнасці дэмакратычных маладзёвых арганізацый, незалежна ад таго, ці здолеюць яны знайсці агульную глебу для супрацоўніцтва і правядзення сумесных акцыяў. Хаця хацелася б, каб было менавіта так.

УЛАСН. ІНФ.

КАРОТКІМ РАДКОМ АБ ЗНАЧНЫХ ФАКТАХ

У згодзе з вясновым надвор'ем

Вясновы росквіт надвор'я напрыканцы мінулага тыдня нібы аказаў стымулюючае дзеянне на шэраг мясцовых грамадскіх арганізацый. Яны, у поўнай адпаведнасці з правіламі прыроды, скінулі з сябе зімовую непаваротлівасць і марудлівасць, праявіўшы незвычайную для лютага актыўнасць, энергічнасць і гатовасць да плённай работы. Дзеля справядлівасці трэба адзначыць, што прыкметна заварушыліся палітыкі і ў сталіцы. Таммэйшая актыўнасць зразумелая: лібералы і шырокае кола апазыцыянэраў рэжыму не губляюць надзеі на абвешчанне прэзыдэнцкіх выбараў і спяшаюцца заявіць аб сабе.

Мясцовыя ж грамадскія актывісты кіруюцца куды больш сціплымі мэтамі, якія адным іншым разам аказваюцца больш карыснымі для, так бы мовіць, агульнай справы. Вось некалькі фактаў апошніх дзён, з якіх, на думку ТМ, можна зрабіць якраз такую выснову. Бо дэмакратычнасць краіны, як вядома, вызначаецца не дэкляраванасцю прынцыпаў свабоды і незалежнасці чалавека ад дзяржавы (як гэта ў нас), а рэальным існаваннем так званага трэцяга сэктара, з дапамогай якога людзі рэалізуюць свае палітычныя, грамадскія, прафэсійныя, творчыя і якія хочаце іншыя інтарэсы, планы і ініцыятывы, не бегаючы кожны раз (зноў жа, як гэта ў нас) за "высочайшим" дазволам ці грашова-маральнай падтрымкай да дзяржаўных арганізацый, мэта якіх — апрыоры — усё заціскаць і трымаць пад кантролем. Змяніць гэта можна не заклікамі, а рэальнымі справамі. Пра іх і паведамляем ніжэй.

ЦЭНТР грамадскіх сувязяў (аб ім — у ТМ N 1) разгледзеў некалькі новых праектаў і ініцыятываў з боку некаторых грамадскіх арганізацый. Дэталёва абмеркаваўшы праекты іх мяркуемых спраў, мерапрыемстваў і акцый, Цэнтр падтрымаў шэраг з іх.

Сярод ухваленых Цэнтрам ініцыятываў гэтым разам былі тыя, што прапанавалі мясцовыя арганізацыі Таварыства беларускай мовы, Праваабарончага цэнтра, гістарычнага аб'яднання "Брама", Беларускай асацыяцыі журналістаў, а таксама рэдакцыйная калегія краязнаўчага часопіса "Магілёўская даўніна".

АДДЗЯЛЕННЕ Беларускага Хэльсінскага Камітэта пашырылася да адпаведнай арганізацыі, што аб'яднала цяпер свае філіі ў раённых цэнтрах вобласці і некалькі калектыўных сябраў у асобе кіраўнікоў шэрагу дэмакратычных грамадскіх арганізацый. На першым арганізацыйным сходзе гаворка ішла аб актывізацыі збору подпісаў пад Хартыяй-97, паглыбленні прапаганды сярод насельніцтва агульначалавечых правоў, аператыўным абагульненні фактаў парушэнняў з боку рэжыма і канкрэтных службовых асобаў вобласці міжнародных дамоўленасцяў па правах чалавека, інфармаванні аб іх міжнароднай і сваёй грамадскасці.

ЭКАЛАГІЧНАЯ грамадская арганізацыя ўтворана на ўстаноўчым сходзе прадстаўнікоў грамадскасці абласнога цэнтру і шэрагу раённых цэнтраў. Гэта сталася магчымым з ініцыятывы магілёўскіх сацыял-дэмакратычных грамадоўцаў (партыі Статкевіча), якія маюць пэўны досьвед у пытаннях абароны навакольнага асяроддзя і змагання з наступствамі чарнобыльскай навалы. Новая арганізацыя мяркуе актывізаваць работу грамадства ў гэтых напрамках, узяць пад свой кантроль дзейнасць адпаведных дзяржаўных установ і ведамстваў, якія апошнім часам не лічаць прыродаахоўчыя праблемы прыярытэтнымі. Яна ж мае намер выступіць аб'яднаўчым цэнтрам для ўсіх, каго хвалююць пытанні беражлівых адносінаў да прыроды, санітарна-гігіенічнага стану гарадскога і вясковага асяроддзя.

З ІНІЦЫЯТЫВЫ раённых і абласной філіі Беларускага Народнага Фронту разгарнулася работа па наладжванню выпуску незалежных газэтаў на месцах. Цяпер выдаюцца дзве недзяржаўныя газэты ў Бабруйску і Шклове, тыраж якіх напачатку не патрабуе афіцыйнай рэгістрацыі выдання. Днямі павінна ўтварыцца новая газэта ў Крычаве. Існаваць недзяржаўным выданням, якія ставяць сваёй мэтай не абслугоўванне ўлады, а распаўсюджванне аб'ектыўнай інфармацыі, надзвычай цяжка, а для супрацоўнікаў нават небяспечна. Таму ТМ з асаблівым пачуццём павагі вітае калегаў з пажаданнем ім прафэсійных удачаў і папулярнасці новым газэтам.

Аддзел навінаў ТМ.

БАЦЬКІ І ДЗЕЦІ! УВАГА: КОНКУРС!

Наш Дом і Храм — Беларусь

Калі вы ведаеце, што жывеце ў еўрапейскай краіне напачатку XXI стагоддзя, **бярыце ўдзел у літаратурна-мастацкім конкурсе.**

Конкурс *Наш Дом — Беларусь у XXI стагоддзі* праводзіцца ў чатырох намінацыях:

1. Беларусы — еўрапейскі народ. (прызы імя Францішака Скарыны);
2. Беларусь — наша Бацькаўшчына, наша Маці! (прызы імя Янкі Купалы);
3. Беларусь — наш Дом, наш Храм! (прызы імя Уладзіміра Караткевіча).
4. Абаронім наш Дом — Беларусь! (прызы імя Алеся Адамовіча).

Дзеці да 7 год робяць надпісы тэмаў конкурсу алоўкамі, малююць або складаюць вершы. Дзеці і падлеткі 7-13 гадоў робяць малюнкі (аплікацыі), пішуць верш або празаічны твор. Падлеткі, дзяўчаты і юнакі 14-17 гадоў ствараюць мастацкі або літаратурны твор.

Тэрмін даслання прац на конкурс: да 18 сакавіка 1998 г.

Падвядзенне вынікаў: да 25 сакавіка 1998 г.

Найлепшыя творы будуць апублікаваныя.

212030, г. Магілёў, а/с 25 з адзнакай "Конкурс".

Кант. тэл. 390-435, 983-255 (Андрэй).



Карэспандэнт ТМ Дзяніс Новікаў (на здымку справа ўнізу) прымаў удзел у чарговай рабочай групе трэнераў Фонда адукацыі для дэмакратыі, якая адбылася ў сярэдзіне лютага ў Берасьці. На сустрэчы маладым трэнерам, якія пасьпяхова скончылі курс і правялі ўжо самастойны сэмінар, былі ўручаныя дыплёмы. Як і папярэднія, гэтыя заняткі прайшлі ў вясёлай сяброўскай атмасфэры, у шчырасці і ветлівасці ў дачыненнях паміж удзельнікамі й інструктарамі пані Эвай Браха і панам Кшыштафам Станоўскім. Гэта добра спрыяла засвойванню новых ведаў.

Віншуем!

БЛІЗКАЯ ГІСТОРЫЯ

...Забыўшыя асуджаны перажыць ізноў

Не аднойчы я на вуліцах Магілёва сустракаю сівога, з барадою, мужчыну. Гэта Чашэй Уладзімір Сцяпанавіч — старшыня грамадскага камітэту ахвяраў рэпрэсій. Адразу перад вачыма зьяўляюцца постаці іншых мужчын і жанчын, звязаных з ім непарыўнай сувяззю ахвяраў таталітарнага рэжыму.

Сталінскія вязьні. Колькі ж іх яшчэ засталося... Больш за дзесяць год таму я пазнаёміўся з тымі з іх, хто жыў у нашым горадзе. Было іх крыху больш за 60 чалавек. 41 нарадзіўся да рэвалюцыі, астатнія ў перыяд 1917-1926 г.г. Дзве трэці былі арыштаваныя ў перыяд з 1934 па 1938 г.г., астатнія ў 1945-1950 г.г.

Сорак чалавек адбылі тэрміны пакарання ад 8 да 17 год, іншыя ад 3 да 7 год. У тым ліку 12 жанчын. А дзве з іх пакутавалі ў лягерах па 17 гадоў! Адна — 15 гадоў! Яшчэ дзве — па 10, астатнія па 5-8. Вышэйшую адукацыю мелі толькі 18 чалавек, дзесяць былі з сярэдняй спэцыяльнай адукацыяй. Большасць да арышту былі рабочымі ды сялянамі.

Уладзімір Сцяпанавіч — сапраўдны рухавік у дзейнасці камітэту. Ягонае спакойнае, вольнае і шчаслівае жыццё раптоўна абарвалася 15 студзеня 1934 году. Яго, 24-х гадовага інжэнера саюзнага праектна-тэхналагічнага інстытуту "Гипромясо" (г.Масква) выклікалі ў аддзел кадраў, адкуль "штатский" чалавек і забраў яго на Лубянку. "Контррэвалюцыянер" зведаў допыты, здзекі. Затым — усе жахі Бутырак, Бамлага, славутых Салаўкоў... У 60-я гады напаткала яго рэабілітацыя. Некалькі год таму, калі ў грамадстве быў вялікі інтарэс да тэмы камуністычнага тэрору, на Салаўках адбылася сустрэча былых вязьняў, іх сваякоў і нашчадкаў. З'ехалася шмат народу з розных куткоў былой імпэрыі. У.С.Чашэй апынуўся там у цэнтры ўвагі. Яго, былога вязня Салаўкоў, імкнуліся засняць на фота і кінастужкі інфармацыйныя агенствы многіх краінаў свету, інтэрв'ю з ім зьявіліся ў шматлікіх газэтах.

Усё менш і менш жывых сведкаў тэрору. І ўсё часцей высоўваюцца тыя, хто катаваў і сажаў, усхваляючы сталінскія часы, часы таталітарызму... Не сустракаю, напрыклад, больш на вуліцах гораду таго чалавека, былога вязня, які ў выніку свайго трагічнага лёсу палохаўся ўсяго і ўсіх. Без яго немагчыма было нават трапіць у ягоную кватэру, бо дачка і жонка ніколі і нікому не адчынялі дзверы. Іх можна зразумець, бо ў свой час на допытах следчыя НКВД згвалцілі —на ягоных вачах — яго жонку. Таму не давяраў нікому.

Памёр і той, хто мог увайсці ў гісторыю Беларусі. Незадоўга да смерці Сталіна яго, аднаго з кіраўнікоў жылёва-камунальнай гаспадаркі Віцебска, арыштавалі, абвінаваціўшы ў тым, што менаіта ён узначальваў "группу врачей", якія хацелі атруціць "мудрого и великого". Але нават следчыя зразумелі, што немагчыма было кіраваць дактарамі ў Маскве, займаючы невялікую пасаду ў Віцебску. Таму асудзілі як звычайнага "врага народа". Гэты чалавек будаваў сакрэтны аб'ект пад Воршай. Затым была рэабілітацыя. У Віцебск не вярнуўся. Не мог бачыць тых, хто здрадзіў яму ў ліхую гадзіну. Да пенсіі працаваў у Магілёве.

...Зайшоў да мяне неяк знаёмы выкладчык унівэрсітэту. Паскардзіўся, што амаль страціў зрок дзядуля жонкі. У мяне зашчаміла сэрца. Гэта ж паэт Рыгор Бохан.

Беларус Рыгор Фёдаравіч Бохан нарадзіўся ў вёсцы Новае Хорабрава Аршанскага раёну ў 1916 г. Атрымаў вышэйшую адукацыю (1965, БДУ). Удзельнічаў у Другой сусветнай вайне, быў камандзірам разведкі савецкіх партызанаў. У момант арышту (красавік 1946) працаваў у рэдакцыі газэты "Рабочий путь" Смаленскай вобласці. Быў абвінавачаны па арт. 72, 65 (памагаты ворагаў). Падчас следства знаходзіўся ў менскім астрозе, 6 месяцаў у адзіночцы. Атрымаў 10 год лягераў, 5 гадоў пазбаўлення правоў. Таксама пераследваліся яго сваякі. Адбываў тэрмін у Комі АССР, працаваў на шахце. Вызваліўся 19.11.1954 г., да 1955 быў адпраўлены на пасяленне. 22.08.1960 — рэабілітаваны. Інвалід. Друкаваўся ў часопісах "Полымя", "Вожык", газэтах "ЛіМ", "Магілёўская праўда", "Магілёўскія ведамасці", "Веснік Магілёва", "Ратуша". Вершы для дзяцей увайшлі ў зборнік 1987 г. пад рэдакцыяй А.Вольскага.

З успамінаў Рыгора Бохана:

— Праца была цяжкая, а ежа была дрэнная. На ўвесь дзень давалі 400 г хлеба, калі добра працуеш — 500 г. Снеданне — баланда з капусты, абед — баланда, і калі-некалі —рыба. Мяса не давалі ніколі. На вячэру зноў баланда. Рэжым быў строгі. Часцяком былі начныя вобыскі. Вязні асабліва палохаліся маёра Барадуліна — начлага. Звер быў. Калі патрапіш яму на вочы, абавязкова апынешся ў карцэры. Са мною разам у лягеры быў магілёвец Лялькоў Уладзімір, зараз ужо памёр. Але б я хацеў знайсці ягоных сваякоў. Ведаю, што ў яго была жонка Галя, сын. Можа, адгукнуцца.

Гартаючы нататнік, знайшоў нумар тэлефона яшчэ аднаго былога вязня. Тэлефаную. Адказвае нявестка: "Памёр".

...Праваслаўны беларус Міроненка Іван Якаўлевіч нарадзіўся ў вёсцы Асінаўка Чавускага раёна (былы Расненскі) у 1902 г. Скончыў рамеснае вучылішча ў Чавусах. У час працы на бацькоўскай гаспадарцы быў арыштаваны па абвінавачванні ў замаху на калгаснага актывіста (арт. 58, п. 11 — звяржэнне Савецкай улады). Падчас следства знаходзіўся ў аршанскім астрозе. Усё жыццё пераследваліся дзве ягоныя сястры, быў рэпрэсаваны бацька. Сам атрымаў 10 год зняволення. Адбываў тэрмін у лягерах N 5, 16 Архангельскай вобласці (ст. Пінюг), на востраве Вайгач, у Паўночнадзвінскай крэпасці. Працаваў на ўмовах вечнай мерзлаты. Вызвалены 8.06.1936 г. Цудам пазбегнуў чарговага арышту —дабраахвотна з'ехаў працаваць на поўнач. Рэабілітаваны 4.10.1963 г.

З успамінаў І.Я.Міроненкі:

— Гэта быў час, калі пачыналася гвалтоўная калектывізацыя. А бацька мой не жадаў уступаць у калгас і вёў самастойную гаспадарку. Вярнуўшыся з гораду, я дапамагаў яму. У вёсцы я лічыўся найбольш адукаваным. Калі нашага суседа несправядліва абклалі вялікім падаткам, то ён звярнуўся за дапамогай да мяне. Я напісаў ліст-скаргу і ў выніку вялікі падатак быў скасаваны на больш мякчэйшы. Мясцовыя "актывісты" мяне такім чынам заўважылі. Надыйшлі выбары ў саветы. Добра памятую тое паседжанне, на якім сабраліся аднавяскоўцы. Прадстаўнікі раённай улады і "актывісты" адразу паселі ў прэзыдыюм. Я абурыўся і сказаў, што іх туды ніхто не выбіраў; нягледзячы на пагрозы начальства, кіраваць сходам вылучылі мяне. І як вынік, сход абраў не таго, каго прапанавалі зверху, а вельмі шаноўнага чалавека. Гэта быў самы вялікі грэх — пайсці супраць кіраўніцтва раёну, таму дараваць мне не маглі. У хуткім часе мяне арыштавалі невядома за што. І далі 10 год. Памятую, у Воршы быў следчым Глазаў, у крэпасці —Штучкоў, астатнія не захаваліся ў памяці.

...Катавалі не толькі мужчынаў, але і кабет. Перад вачыма стаіць сустрэча з такой пакутніцай. Невялічкая кухня ў кватэры побач з кінатэатрам "Кастрычнік". У вачах жанчыны спалох. Дзеці і ўнукі не ведаюць, што блізкі ім чалавек — былы вязень. Яна патрабуе, каб пры іх ніякай размовы пра яе мінулае не было. Каб і далей родныя ня ведалі...

АД РЭДАКЦЫІ: на гэтым месцы мы з цяжкасцю ў сэрцы перапыняем (з-за памераў матэрыяла) гэты трапяткі артыкул нашага аўтара, адначасова выказваючы яму ўдзячнасць за вышуковую і літаратурную работу па вельмі важнай для ўсіх нас, на жаль, усё яшчэ актуальнай для Беларусі тэмы. У наступным нумары газэты мы працягнем друкаванне артыкула з гэтага эпізода. Пакуль што перажывем тое, пра што прачыталі вышэй...



Патрэбна ўсім нам

Наша жыццё ў апошнія гады ўсё шырэй закранае працэс рэлігійнага адраджэння. Намаганнямі саміх людзей ствараюцца рэлігійныя прыходы, аднаўляюцца культавыя будынкі, наладжваюцца рэгулярныя набажэнствы. Не абмінула жыватворная хваля і наш Шклоў. Да Праабражэнскай царквы, малітоўнага дому Евангельскіх хрысціян-баптыстаў нядаўна дадаўся і мясцовы каталіцкі храм.

Каталіцкія прыходы існавалі на Шклоўчыне са старажытных часоў. У пачатку 17 стагоддзя ў мястэчку быў пабудаваны касцёл і заснаваны манастыр каталіцкага ордэну дамініканаў. Прываблівваў людзей велічны будынак касцёла ў вёсцы Фашчаўка. Сюды на святы некалі збіраліся вернікі з усёй Беларусі, бо далёка разыходзілася слава "Дзевы Марыі Фашчаўскай"...

Цяжкі лёс каталіцкага прыходу ў горадзе Шклове пачаўся даўно. Расейскія ўлады ў 1830-31 г.г. у комплексе мерапрыемстваў, якія праводзіла імпэрыя па русіфікацыі Беларусі, зачынілі манастыр дамініканаў. Зведаў касцёл і час ваяўнічага атэізму. У 70-х гадах нашага стагоддзя яго зачынілі камуністы.

З пачаткам набыцця суверэнітэту краіны, у 1994 г. да шклоўскіх каталікоў упершыню прыехаў з Магілёва ксёнз Браніслаў Карвоўскі. З тае пары тут пачаліся рэгулярныя набажэнствы. Аднойчы завітаў у той час на імшу і аўтар гэтых радкоў. Калі я ўвайшоў у памяшканне былога храма, мяне ўразіла, што ў ім было надта светла. Толькі потым я ўбачыў, што ў будынку проста не было даху.

І вось цяпер, праз чатыры гады, адноўлены дах, устаноўлены крыжы, адрамантаваны сцены. Хоць шмат яшчэ трэба зрабіць. Агульнымі намаганнямі яшчэ адна хрысціянская святыня —шклоўскі касцёл святых Пятра і Паўла —адраджаецца і набывае свой спрадвечны выгляд.

Храм патрэбны вернікам і ўсім нам як важкі куток духоўнасці і культуры.

Аляксандр ГРУДЗІНА, Шклоў.

Дзе падзелася святая?

Некалькі год таму ў Магілёве быў праведзены рэспубліканскі пленэр па скульптуры. Майстры з розных гарадоў, паказаўшы свае здольнасці, пакінулі ў дар гораду каля двух дзесяткаў драўляных скульптур. Большая частка з іх і сёння ўпрыгожвае скверы на вуліцах нашага гораду. Найбольш выдатныя працы былі адразу размешчаныя побач з мастацкім музэем, па настойлівай просьбе члена экспэртнай рады пленэра, дырэктара музэя Сайко В.В. У маляўнічым куточку, ля прыгожых бяроз, уздоўж вуліцы Першамайскай знайшла сваё пачэснае месца скульптура Хрысціянскай святой. Па крыжу ў яе руках жыхары бачылі ў ёй вобраз апякункі зямлі беларускай св. Еўфрасінні Полацкай.

Гэта быў сапраўдны цуд — пачалося адраджэнне духоўнасці і хрысціянства, адраджаліся храмы і вярталіся выявы святых. Але мінула колькі год, і было вырашана надаць мастацкаму музэю імя народнага мастака П.Масленікава і побач з музэем ўстанавіць ягоны бюст. Усе пагаджаліся, што бюст гарманічна выглядаў бы каля ўваходу ў музэй. А найлепшым выйсцем было б размясціць яго на месцы помніка У.Леніну. Гэты помнік быў зроблены ў свой час безгустоўна і паспешліва, ён не мае аніякай мастацкай каштоўнасці — з гэтым пагаджаліся мастакі, архітэктары, работнікі культуры. Але ж гэта не было ўлічана. Помнік Леніну пакінулі, — усім вядома прыхільнасць Сайко В.В. да гэтай асобы.

А для бюстра Масленікава знайшлі месца: узялі ды выкапалі скульптуру святой! Я нічога не маю супраць Масленікава. Здзіўляе і палохае вяртанне ізноў да сатанізму на ўладным узроўні. Ленін, які загадваў зачыняць і знішчаць цэрквы, стаіць, а святая знікла...

Мінула паўгода як прыбралі яе скульптуру, і ўзнікае пытанне да ўладаў: дзе яна? Чаму так здзекуюцца з пачуццяў хрысціян?

Ігар Аляксандраў, Магілеў.

"Ты паменей гавары..."

ПАВАЖАНЫ "ТЫДНЁВІК МАГІЛЁЎСКІ"!

Нарэшце ты пайшоў у продаж і ў правінцыйныя гарадкі. Раней, калі быў выпадак, купляў у Магілёве твае прыметныя красныя нумары, але гэта было зрэдку. І вось зараз зьявілася магчымасць чытаць цябе без перапынку. З гэтае нагоды віншую рэдакцыю і прапаную дапамагаць вам патрэбнай інфармацыяй і некаторымі звесткамі. У гэты раз дасылаю прыпеўкі, якія ў свой час былі надрукаваныя ў "Звяздзе". Вы змясцілі ў 2 нумары матэрыял гісторыка А.Краснаслабодцава пра фальклёрнае адлюстраванне савецкага ладу, які ў нас пануе і зараз. Думаю, што гэтую тэму ёсць сэнс працягваць.

У мяне ёсць трохі інфармацыі пра моўную палітыку іншых краінаў, пра ўраджэнцаў Магілёва і Магілёўшчыны ды іншае, тое, што зацікавіла б чытачоў. Мая прафэсія (бібліятэкар) дазваляе мне знаёміцца з самымі рознымі газэтамі й часопісамі. Напрыклад, сумна вядомы "Славянский набат" (№ 4, 1998, ст. 2) друкуе прамову мэра Менска В.Ярмошына аб дасягненнях у сацыяльнай сфэры. Ён кажа: "К сожалению, рождаемость в Минске на 1,5 тыс. человек ниже смертности". І вось ягонае арыгінальнае тлумачэнне гэтай сітуацыі: "Эта картина является отражением общей тенденции к падению рождаемости во многих европейских странах". Зрабіце ў сябе дайджэст такіх "думак" прадстаўнікоў вертыкальнай улады, гэта будзе толькі на карысць газэце.

Поспехаў Вам у Вашай працы.

Сяржук АРЖАНЦАЎ, Клімавічы.

Ах, рэдакцыя "Звязды",
Як ты просіш нас заўзята:
Вышлі фота, адрас хаты...
Каб лягчэй было за краты?

***

Я на конкурс слаў прыпеўкі,
А адтуль ні "бэ", ні "мэ".
Кажуць, гэтыя паперкі
Разглядае КаГэБэ!

***

Будзе хата для мяне
У турме за кратамі,
Бо прыпеўкі ўсе мае
Крытыкай багатыя.

***

Вецер вее ўгары,
А долу зацішна.
Ты паменей гавары,
Як бы што не выйшла.



Здымак друкуецца з нагоды набліжэння, а будзе гэта 25 сакавіка, 80-годдзя Беларускай Народнай Рэспублікі. На здымку першы ўрад незалежнай Беларускай краіны. Краіну і гэтых людзей расейскія і свае бальшавікі знішчылі. Бо для іх, як гэта зразумела нам зараз, было відавочна: перад імі інтэлігентныя высакародныя людзі. Гэта бачна здалёк і скрозь не надта якасную фотарэпрадукцыю... Сёлета ўгодкі БНР будуць святкавацца патрыятычнай грамадскасцю асабліва шырока, смела і масава. Аб гэтым найбольш поўна будзе пададзена ў нашай газэце. Сачыце за яе сакавіцкімі нумарамі: разам сустрэнем і адзначым свята. Адмысловы нумар да юбілею — 20 сакавіка.

МОЎНЫЯ СПРЭЧКІ

Апошні, а можа і першы бастыён свабоды

Ці многія з нашых чытачоў ведаюць, што ў ЗША знаходзіцца і працуе прызнаная многімі краінамі свету Рада Беларускай Народнай Рэспублікі... Адзін з дабраахвотна ўзятых на сябе ейных пачэсных клопатаў — клопат аб захаванні чысціні роднай мовы. Не так даўно Рада прыняла адмысловую пастанову па гэтай праблеме. У ёй звяртаецца ўвага міжнароднай і беларускай грамадскасці на тое, што палітычны рэжым у Беларусі па-ранейшаму, як тое было за камуністамі, варожа ставіцца да мовы, вынішчае яе з дзяржаўнага і бытавога ўжытку, забараняе вяртанне да ўласцівых беларускай мове асаблівасцяў і адметнасцяў, працягваючы тым самым бальшавіцкую палітыку так званага «набліжэння беларускай мовы да расейскай». Рада мяркуе склікаць на гэты конт міжнародную навукова-практычную канферэнцыю з тым, каб пацвердзіць самабытнасць мовы, патрабаваць ад беларускай улады зняцця перашкодаў на шляху вяртання мовы да сваёй адметнасці, праз якую толькі і магчымае шырокае і сапраўднае нацыянальнае Адраджэнне.

Рэдакцыя Тыднёвіка звярнулася па каментар з нагоды Пастановы Рады БНР да Міхася Булавацкага. Ягоны роздум мы друкуем з адначасовым паведамленнем аб тым, што прадаставім месца для працягу гаворкі на гэтую тэму, калі ў чытачоў зьявіцца жаданне падтрымаць выказаныя думкі або паспрачацца з імі.

Мова можа стаць апошнім бастыёнам свабоды.
Хайнрых Бёль, нямецкі пісьменнік, нобелеўскі лаўрэат.

Некаму можа падасца, што гэта нейкія дзіцячыя гульні: Рада неіснуючай краіны БНР, яе пастановы... Чарговае донкіхоцтва?

Але агледзімся і задумаемся.

На Ўсебеларускі кангрэс, скліканы ў снежні 1917 года, з'ехаліся прадстаўнікі ўсіх сацыяльных слаёў і праслоек беларускага грамадства, усіх нацыянальных меншасцяў і большасцяў — амаль 2000 дэлегатаў. Гэта быў цалкам паўнамоцны, дэмакратычна створаны орган, у чым спачатку не сумняваліся і бальшавікі, бо нават выдзелілі частку грошай, неабходных для яго правядзення. Але пазней, калі пабачылі, куды скіраваныя рашэнні кангрэса (а яны былі скіраваны на суверэнітэт), яны ж яго і разагналі, пазней перастраляўшы частку дэлегатаў.

Кангрэс, аднак, паспеў стварыць Раду, якой перадаў усе неабходныя для дзейнасці вышэйшага дзяржаўнага інстытута паўнамоцтвы. З таго часу Рада БНР дзейнічае, хаця вымушана дзейнічаць у эміграцыі. Дзейнічае яна на цалкам прававой аснове, і не ўлічваць гэтага не могуць ні расейскія марыянеткі, якія і па сёння царуюць на Беларусі, ні іншыя дзяржавы, якія маюць тыя ці іншыя стасункі з Беларуссю.

Досыць верагодна, што рашэнні-пастановы Рады БНР стануць некалі законамі незалежнай беларускай дзяржавы. Я ў гэта веру і менавіта з гэтых пазыцый ацэньваю пастанову «Пра абарону мовы».

Так, 1933 год — асабліва чорны год для беларускай мовы. Рэформа беларускага правапісу, д'ябальскі прадуманая, стала тым крокам, якім сталінская тэорыя зліцця нацый і моваў пачала свой рух па неабсяжным СССР.

Беларускай мове быў нададзены прарасейскі «пранонс», пасля чаго зручна стала гаварыць, што гэта не асобная мова, а заходнерасейскі дыялект. Беларуская мова страціла сваю мяккасць, агрубілася, страціла адметнасць канчаткаў, набыла неўласцівыя для яе суфіксы -ем, -ім, -уч, -юч, -уўш ды іншыя, напалову страціла пераднаціскное «я», «прыняла» безнаціскныя «э» і «о» (словынаватворы загадана было вымаўляць з расейскім «о»: «сОцыялізм, кОмунізм, кОмітэт...).

Знявечаная мова 60 год навязвалася народу праз школы і газэты. Узгадаваны за гэты час ледзь не пакаленні беларускіх пісьменнікаў і журналістаў, навукоўцаў і настаўнікаў, якія іншай беларускай мовы ня ведаюць і не хочуць ведаць (менавіта з іх боку чуюцца скаргі, што беларускамоўная літаратура, друк і школа не карыстаюцца попытам у насельніцтва). Насамрэч гэта ІХ мова не карыстаецца попытам.

Такая мова, на жаль, стала нашай агульнай мовай. Народ, як змог, прыхарашыў і акультурыў яе, надаў знявечанай мове высакародства, ачысціў ад дзікунскіх новаўвядзенняў. І яна не загінула канчаткова, ажыла і нават расквітнела Быкавым і Караткевічам, Гілевічам і Брылём... І не думае знікаць. А ўзняцца, ажыць і ўзмацнець пасля такіх ран можа толькі вельмі жыццяздольная мова. Гэтай мове наканавана доўгае і плённае жыццё. І таму самы час ёй ачысціцца ад чужацкага ўплыву, вярнуць ёй ранейшую мілагучнасць. І ў нечым ўдасканаліцца, бо апошнія 60 гадоў зусім выкідаць з яе гісторыі ня трэба.

У гэтым святле вельмі актуальным становіцца правядзенне навукова-практычнай канферэнцыі, аб якой гаварыцца ў Пастанове Рады БНР. І можа нават не адной канферэнцыі, а некалькіх, паміж якімі трэба, каб працавала моўная аўтарытэтная камісія.

Зразумела, што не ўсё з «дарэформенага» мінулага будзе прынята ў новы правапіс. Зразумела, што будзе прынята нешта з таго, чаго 60 год назад не было. Зразумела, што будуць гарачыя спрэчкі і дэбаты. Чакаецца нават рэформа альфабэту (алфавіту, калі гаварыць з расейскім «пранонсам»), бо зусім відавочна, што дзве літары трэба будзе ўставіць туды: «дзэ» і «джэ». Сёння гэтыя гукі падаюцца пры пісьме падвойнымі літарамі, што стварае непатрэбныя праблемы для чалавека, які пачынае вывучаць беларускую мову (я чуў, як чытаюць: д-зюба, дож-д-ж; а расейскае тэлебачанне расказвала пра беларускія «Дзяды», выгаворваючы так: Д-зяды; ды і ў беларускіх газэтах часта спатыкаюся на пераносах кшталту «пад-зівіцца»). Сказаныя шэптам, гэтыя гукі чуюцца як «цэ» і «чэ», а не падвойнымі «тсэ» і «тшэ». Таму й трэба каб яны мелі свой знак-літару.

Усё гэта чакае грунтоўнага і асцярожнага ўпарадкавання. Усё гэта пройдзе праз доўгія і вострыя дыскусіі. Але галоўнае пытанне трэба зняць адразу: які з правапісаў прыняць за аснову — сённяшнюю ўпадкаваную наркомаўку ці класічную граматыку (да 1933 г.). Адказ відавочны: калі чалавека выпускаюць з вязьніцы, пераканаўшыся ў памылковасці ягонага зняволення, яму павінны вярнуць усё, што ў яго было да зняволення.

Беларускай мове павінны вярнуць адабранае. Гэта неабходны крок да яе новага жыцця, да яе новай славы.

Міхась БУЛАВАЦКІ,
старшыня абласной арганізацыі Таварыства беларускай мовы.

МАГІЛЁЎ: ДАЎНІНА І СУЧАСНАСЦЬ

Гістарычны агляд І.Марзалюка

З кім гандляваў наш горад у XVI-XVIII ст.ст?



Магілёў у другой палове XVI-першай палове XVII ст. ст. быў буйным гандлёвым цэнтрам Беларусі. Магілёўскія купцы вялі гандаль з Віцебскам, Менскам, Полацкам, Гародняй, Берасцем, Слуцкам, Слонімам, Наваградкам, Воршай, Ігуменам, Капылём, Мсціславам, Крычавам, Прапойскам, Чавусамі, Чачэрскам, Рэчыцай, Гомелем, Шкловам, Копыссю, Галоўчыным, Бялынічамі, Бешанковічамі, Бабруйскам, Дуброўнай, Улай, Лукомлем, Смалянамі, Талочынам, Заслаўем, Бабром, Барысавым, Быхавым і прылеглымі мястэчкамі, у якіх у радыюсе 10 міляў магілёўскія купцы вызваляліся ад гандлёвых пошлінаў. У гэты час горад вёў актыўны гандаль з гарадамі Расейскай дзяржавы, Украіны, Польшчы, Балтыі і Чэхіі.

У культурным слоі XVI-XVIII ст. ст. імпартныя тавары прадстаўлены пераважна керамічнымі і шклянымі вырабамі. Гэта, у першую чаргу, так званы каменны тавар — кераміка, вырабленая ў рэйнскіх гарадах. Найбольш ранняя рэйнская кераміка ў Магілёве знойдзена ў адкладах першай паловы XVII ст.

Цікавай знаходкай зьяўляецца фрагмент паліхромнага куфля рэйнскай керамікі. Куфель меў вялікую зграбную ручку петляпадобнай формы. Звонку ён аздоблены рыфленнем і выявамі рэльефных разетак са шматпялёсткавымі кветачкамі. Выраб пакрыты салянай глазурай двух колераў — белай і сіняй. Верагодней за ўсё гэта вестэрвальдская кераміка. Пачатак яе вытворчасці прыпадае на 1590 г. Тыповымі для яе былі вырабы шэрага колеру, упрыгожаныя блакітнай глазурай, так званыя блакітныя творы — «Blauwerk». Яны атрымалі шырокае распаўсюджванне ў XVII ст. Шырока распаўсюджаны ў адкладах XVIII-XIX ст. ст. фрагменты бутэлек рэйнскай керамікі з карычневай глазурай. У калекцыі ёсць цэлая форма бутэлькі з-пад сельтэрскай канца XVIII-пачатку XIX ст.ст., што была выраблена ў Насаў.

У Магілёве знойдзены фрагменты белагліняных галанскіх люлек. На адной з люлек ёсць кляймо ў выглядзе кароны, пад якой змешчана манаграма «І.Р.». Датуюцца другой паловай XVII— пачаткам XVIII ст.ст.

Для напластаванняў канца XVIII—пачатку XIX ст.ст. уласцівы памадныя слоікі, што скарыстоўваліся ў якасці аптэчнага посуду. Усе знойдзеныя памадныя слоікі пакрыты эмаллю сіняга, блакітнага, чорнага колераў. Аналагічны посуд знойдзены ў напластаваннях Віцебска XVIII—пачатку XIX ст.ст., Менска, Мсціслава і Масквы.

Да бясспрэчна імпартных шкляных вырабаў гэтага часу неабходна аднесці фрагменты квартаў XVII-XVIII ст. ст. з надпісам «London». Частка посуду прывозілася з іншых гарадскіх цэнтраў Беларусі. Нам пашанцавала знайсці цэлую кварту сярэдзіны XVII ст. На плечуку кварты маецца кляймо, на якім лацінкай змешчаны надпіс «HOMEL».

АДКАЗЫ НА КРЫЖАСЛОЎ,
апублікаваны ў мінулым (2) нумары Тыднёвіка

Па гарызанталі: 2. Ламачча. 7. Разора. 8. Прысак. 11. Глузд. 13. Трасца. 15. Аснова. 17. Пах. 18. Збан. 19. Крок. 20. Кут. 24. Ахвяра. 26. Мастак. 27. Брама. 28. Коўдра. 29. Кудлач. 31. Валёнак.

Па вертыкалі: 1. Жах. 3. Акруга. 4. Чарада. 5. Паркан. 6. Папрок. 9. Пуня. 10. Страхар. 12. Карункі. 14. Цэбар. 16. Стома. 21. Зварот. 22. Шпак. 23. Атопак. 25. Аборка. 26. Маруда. 20. Лёс.

Аляксандр Ліцін: Фота-экспазыцыя

Сёння ўвечары ў памяшканні музэя этнаграфіі (каля драмтэатра) адчыняецца выстава фотатвораў Аляксандра Ліціна, якую ён прыгожа назваў «Страна иллюзий». Выставе прысвечаны буклет, у якім журналісцкі калега Аляксандра па рабоце ў хімвалакноўскай газэце «Трудовая слава» Сяргей Шышкін таксама прыгожа і тонка разбірае і ацэньвае шматбаковую рэпарцёрскую і мастацкую творчасць фотамайстра. Прызнаючы, што лепш не скажаш, мы са свайго боку адгукаемся на выставу вось гэтымі двума ліцінскімі здымкамі, якія, на нашу думку, пераканаўча ілюструюць найпершую якасць чалавека з фотаапаратам, яго схіленне перад заўсёды непаўторным імгненнем жыцця.

Разам з віншаваннем і прадбачаннем поспеху імпрэзы, мы выказваем Аляксандру ўдзячнасць за ягонае творчае супрацоўніцтва і з нашай газэтай. Разлічваем, што яно працягнецца на ўзаемную карысць.

ТЫДНЁВІК.



Рэдактар Генадзь СУДНІК





Аналітычна-інфармацыйная газета, заснаваная Магілёўскай гарадской асацыяцыяй "КОЛА СЯБРОЎ".

Зарэгістравана ў Дзяржкамітэце Рэспублікі Беларусь па друку за № 831.

Газета выходзіць па пятніцах, пераважна на беларускай мове..



Кошт аднаго асобніка газэты ў гандлі праз сістэму Саюздруку — 3.000 рублёў. У свабодным продажы і ў грамадскіх распаўсюджвальнікаў — па дамоўленасці.



АДРАС РЭДАКЦЫІ:
212030 г. Магілёў, вул. Першамайская, 6-22.



ТЭЛЕФОНЫ:
31-04-15,
22-97-82

Газета набрана і надрукавана афсетным спосабам у Магілёўскай абласной друкарні імя Я.М.Свярдлова. Зак. 3. Тыраж 1100 асобнікаў.